Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

Репозиторий БрГУ

# КОММУНИКАТИВНОЕ ПРОСТРАНСТВО И ИНФОРМАЦИОННОЕ ПОЛЕ В ЯЗЫКЕ И РЕЧЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Сборник материалов
Республиканской научно-практической конференции

Брест, 12 апреля 2018 года

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2018

УДК 373.5.016:81(082)
ББК 81.2Рус+81.4Беи
К 63

*Рекомендовано редакционно-издательским советом Учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Рецензенты:*

доктор филологических наук профессор **В.И. Сенкевич**
кандидат филологических наук доцент **Н.Н. Борсук**

*Научный редактор*
кандидат филологических наук доцент **Г.М. Концевая**

Репозиторий БрГУ

К 63 **Коммуникативное** пространство и информационное поле в языке и речевой деятельности : сб. материалов Респ. науч.-практ. конф., Брест, 12 апр. 2018 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; науч. ред. Г. М. Концевая. – Брест : БрГУ, 2018. – 197 с.
ISBN 978-985-555-808-9.

В сборнике представлены материалы, посвященные вопросам исследования коммуникативного пространства и информационного поля в языке и речевой деятельности.

Издание адресовано научным работникам, преподавателям высших учебных заведений, учителям, аспирантам, магистрантам и студентам.

**УДК 373.5.016:81(082)**
**ББК 81.2 Рус+81.4 Беи**

**ISBN 978-985-555-808-9**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2018

Творчасць С. Алексіевіч дапаўняе і абагачае традыцыйную нацыянальную канцэпцыю рэцэпцыі мастацка-публіцыстычнага тэксту. Функцыянальная скіраванасць яе тэксту заключаецца ў імкненні прасачыць эмоцыі і пачуцці чалавека, што ў канчатковым выпадку павінна спрыяць абагачэнню чытачоў новымі ведамі, духоўнымі арыенцірамі і каштоўнасцямі, новымі магчымасцямі самарэалізацыі і самапазнання, што падкрэслівае і сама пісьменніца: «Мяне цікавіла не само здарэнне… а адчуванні, пачуцці людзей, якія дакрануліся да невядомага» [1, с. 25]. Мастак слова арыентуе рэцыпіентаў на небяспеку застацца ў межах адзіна інтэлектуальнага прачытання тэксту і сцвярджае важнасць эмацыйнай рэцэпцыі, бо ў літаратуры, як і ў любым мастацтве, большая частка таго, што ўспрымаецца рэцыпіентамі, застаецца па-за парогам мыслення, «рацыо».

Вызначыўшы жанр «Чарнобыльскай малітвы» як «хроніка будучыні», пісьменніца пазбавілася ад неабходнасці прытрымлівацца строгіх жанравых канонаў. У выніку творчая прырода новага жанру мастацкай публіцыстыкі дазволіла звяртацца да рознага роду асацыяцый, вобразных абагульненняў, рытарычных адступленняў, аналогій, цытацыі старонак СМІ і выказванняў публічных грамадскіх асоб, успамінаў шырокіх колаў насельніцтва, філасофскіх разважанняў, аўтарскага каментарыя і інш.: «Я пачаў сумнявацца, што лепш: помніць ці забыць?» [1, с. 79]; «Чаму я не магу быць шчаслівай?» [1, с. 93]; «Хто віноўны? Ну хто віноўны, акрамя нас саміх?» [1, с. 109]; «Пісаць пра гэта зараз, усяго дзесяць гадоў прайшло… пісаць? Думаю, бессэнсоўна!» [1, с. 113]; «Што нам рабіць сёння з гэтай праўдай? Зараз? Што з ёй рабіць?» [1, с. 196].

Мастацка-публіцыстычны тэкст С. Алексіевіч праз апеляцыю да гістарычнай памяці і культурных традыцый у эпоху страты ў грамадстве каштоўнасных арыенціраў, парушэння духоўнай парадыгмы нацыі адзначыў яе асаблівую пісьменніцкую і грамадзянскую місію напрыканцы другога тысячагоддзя. Яе тэкст адрасаваны менавіта чытачу ўважліваму, які ўмее разважаць, будаваць гіпотэзы, чытаць «пазатэкставае». Характэрна ў гэтым плане назва аднаго з загалоўкаў «Чарнобыльскай малітвы» – «Інтэрв'ю аўтара з самім сабой аб гісторыі, якую прапусцілі». Мастак слова як бы ўключае рэцыпіентаў у актыўнае разуменне і ўспрыняцце тэксту, актуалізацыі сваіх фонавых ведаў аб тым, што было «прапушчана». Падобнае «ўключэнне чытачоў» у актыўную рэцэпцыю аўтарка мадэлюе і праз семантычныя паўторы: «Прызнанні паўтараліся, і я свядома не апускала гэтыя паўторы ў кнізе. І, наогул, паўтораў сустрэнецца шмат» [1, с. 26]. Б.М. Бернштэйн падобны зварот да тэксталагічных паўтораў тлумачыў наступным чынам: «Паўторныя паведамленні вяртаюць забытае: не дадаючы новых ведаў, яны захоўваюць ужо наяўнае, аднаўляюць і бесперапынна "дабудоўваюць" разбурэнні, якія

Творчасць С. Алексіевіч дапаўняе і абагачае традыцыйную нацыянальную канцэпцыю рэцэпцыі мастацка-публіцыстычнага тэксту. Функцыянальная скіраванасць яе тэксту заключаецца ў імкненні прасачыць эмоцыі і пачуцці чалавека, што ў канчатковым выпадку павінна спрыяць абагачэнню чытачоў новымі ведамі, духоўнымі арыенцірамі і каштоўнасцямі, новымі магчымасцямі самарэалізацыі і самапазнання, што падкрэслівае і сама пісьменніца: «Мяне цікавіла не само здарэнне… а адчуванні, пачуцці людзей, якія дакрануліся да невядомага» [1, с. 25]. Мастак слова арыентуе рэцыпіентаў на небяспеку застацца ў межах адзіна інтэлектуальнага прачытання тэксту і сцвярджае важнасць эмацыйнай рэцэпцыі, бо ў літаратуры, як і ў любым мастацтве, большая частка таго, што ўспрымаецца рэцыпіентамі, застаецца па-за парогам мыслення, «рацыо».

Вызначыўшы жанр «Чарнобыльскай малітвы» як «хроніка будучыні», пісьменніца пазбавілася ад неабходнасці прытрымлівацца строгіх жанравых канонаў. У выніку творчая прырода новага жанру мастацкай публіцыстыкі дазволіла звяртацца да рознага роду асацыяцый, вобразных абагульненняў, рытарычных адступленняў, аналогій, цытацыі старонак СМІ і выказванняў публічных грамадскіх асоб, успамінаў шырокіх колаў насельніцтва, філасофскіх разважанняў, аўтарскага каментарыя і інш.: «Я пачаў сумнявацца, што лепш: помніць ці забыць?» [1, с. 79]; «Чаму я не магу быць шчаслівай?» [1, с. 93]; «Хто вінаваты? Ну хто вінаваты, акрамя нас саміх?» [1, с. 109]; «Пісаць пра гэта зараз, усяго дзесяць гадоў прайшло… пісаць? Думаю, бессэнсоўна!» [1, с. 113]; «Што нам рабіць сёння з гэтай праўдай? Зараз? Што з ёй рабіць?» [1, с. 196].

Мастацка-публіцыстычны тэкст С. Алексіевіч праз апеляцыю да гістарычнай памяці і культурных традыцый у эпоху страты ў грамадстве каштоўнасных арыенціраў, парушэння духоўнай парадыгмы нацыі адзначыў яе асаблівую пісьменніцкую і грамадзянскую місію напрыканцы другога тысячагоддзя. Яе тэкст адрасаваны менавіта чытачу ўважліваму, які ўмее разважаць, будаваць гіпотэзы, чытаць «пазатэкставае». Характэрна ў гэтым плане назва аднаго з загалоўкаў «Чарнобыльскай малітвы» – «Інтэрв'ю аўтара з самім сабой аб гісторыі, якую прапусцілі». Мастак слова як бы ўключае рэцыпіентаў у актыўнае разуменне і ўспрыняцце тэксту, актуалізацыі сваіх фонавых ведаў аб тым, што было «прапушчана». Падобнае «ўключэнне чытачоў» у актыўную рэцэпцыю аўтарка мадэлюе і праз семантычныя паўторы: «Прызнанні паўтараліся, і я свядома не апускала гэтыя паўторы ў кнізе. І, наогул, паўтораў сустрэнецца шмат» [1, с. 26]. Б.М. Бернштэйн падобны зварот да тэксталагічных паўтораў тлумачыў наступным чынам: «Паўторныя паведамленні вяртаюць забытае: не дадаючы новых ведаў, яны захоўваюць ужо наяўнае, аднаўляюць і бесперапынна "дабудоўваюць" разбурэнні, якія

наносяцца часам устойлівым структурам думкі, паводзін, арганізацыі» [2, с. 107–108].

Такім чынам, спецыфіка рэцэпцыі мастацка-публіцыстычнага тэксту С. Алексіевіч дэтэрмінуе значнасць аўтарскага модусу, у якім суб'ектна-ацэначная пазіцыя аўтара дапамагае рэцыпіенту ў спасціжэнні скрытых імпліцытных сэнсаў тэкстаў. Мастацка-публіцыстычны тэкст пісьменніцы, з аднаго боку, адлюстроўвае стэрэатыпы масавай, нацыянальнай свядомасці, а з іншага – скіроўвае чытача да пэўнага тыпу рэцэпцыі твора, фарміруючы тым самым жыццёвыя прыярытэты, мадэлі паводзін, філасофію мыслення.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Алексиевич, С. А. Чернобыльская молитва / С. А. Алексиевич. – М. : Остожье, 1998. – 223 с.
2. Бернштейн, Б. М. Традиция и социокультурные структуры / Б. М. Бернштейн // Совет. этнография. – 1981. – № 2.

**М.І. Сянкевіч**
Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

## НАВУЧАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ СКЛАДАННЮ ФАНТАЗІЙНЫХ ГІСТОРЫЙ

Няма нічога ў нашым паўсядзённым жыцці і ў нашай свядомасці, чаго нельга было б перадаць словам. Невыказную радасць адчувае дзіця, кожны раз адкрываючы для сябе, што адным і тым жа словам можна назваць розныя рэчы, дзеянні, з'явы, што ў яго можна проста гуляць, нарэшце, што ўжо ў самім слове прыхавана патаемная меладычнасць.

Чаму слова *грозны* вымаўляецца строга, а слова *ціхі* – ледзь чутна? Чаму слова *хутка* вымаўляецца паскорана, а слова *павольна* – наадварот? Пытанні, на якія дзеці наўрад ці адкажуць, але галоўнае – задумаюцца над імі, здзівяцца з'явам і назвам, пачнуць параўноўваць. Слова *усё можа* – да такой высновы прыходзяць вучні, адчуваючы ўсёмагутнасць і ўніверсальнасць гэтай моўнай адзінкі. Менавіта слова вылучае «нешта» з бясконцага свету прадметаў, з'яў і пачуццяў і замацоўвае ў дзіцячай свядомасці, робіць гэта «нешта» фактам свядомасці.

У дадзеным артыкуле размова ў першую чаргу пойдзе пра асацыяцыі, выкліканыя словам. Знакаміты італьянскі пісьменнік і педагог Джані Радары, аўтар кнігі «Граматыка фантазіі», заўважыў у гэтай сувязі, што слова, якое запала ў дзіцячую душу, выклікае цэлы шэраг ланцуговых рэакцый, нараджае гукі і вобразы, асацыяцыі і ўспаміны.

Репозиторий БрГУ

партыйных дзеячаў. Асабліва востра гучыць тэма асуджэння псіхалогіі і філасофіі чыноўнікаў, іх цынізму, нахабства, ліслівасці, пыхлівасці, падхалімства, палахлівасці, прыстасавальніцтва, безыніцыятыўнасці, бязвольнасці і аморфнасці кіраўнікоў, начальства, якіх навучылі маўчаць і патрабаваць выканання ад падначаленых бязглуздых загадаў вышэйшых органаў.

Такім чынам, традыцыйныя гіпертэмы (маральнага выбару, экалогіі, кахання, крытыкі ўлады, трагедыі асобы ў модусе соцыуму і інш.) у творчасці згаданых пісьменнікаў трансфармаваліся ў комплекс звязаных між сабой дыскурсіўным узаемадзеяннем адрасанта і адрасата мікратэм. Тэматычны дыяпазон творчасці мастакоў арганізуе мастацкія сэнсы і матыўныя комплексы тэкстаў, якія семантычна вар'іруюцца ў розных творах, праграмуючы сюжэтнае развіццё і ўтвараючы па-сапраўднаму «сюжэтагенны» канцэптуальны феномен іх мастацкага свету.

**В.М. Смаль**
Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

## СПЕЦЫФІКА РЭЦЭПЦЫІ МАСТАЦКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА ТЭКСТУ С.А. АЛЕКСІЕВІЧ

У нацыянальным літаратуразнаўстве канца XX ст. актуалізавалася праблема рэцэпцыі мастацкага твора. У выніку быў пашыраны погляд на рэцэпцыю з простага прачытання ідэйна-мастацкіх асаблівасцей тэксту да больш шырокага ўключэння ў рэцэпцыю канцэпцый аўтара, эпохі, літаратурнай традыцыі і інш. Выявілася, што паўнавартасная рэцэпцыя мастацка-публіцыстычнага тэксту можа быць ажыццёўлена толькі найбольш дасведчаным, добра інфармаваным і крытычна арыентаваным рэцыпіентам. Толькі ён здольны паўнавартасна разгледзіць функцыянаванне літаратурнага дыскурсу (прасачыць біяграфію пісьменніка, улічыць інтэрв'ю мастака ў СМІ, прааналізаваць даведачную і літаратуразнаўчую інфармацыю, ацаніць статус пісьменніка ў грамадстве і літаратуры). Гэты чытач здольны абстрагавацца ад выключнага прачытання ізаляванага тэксту, факусуецца на шырокім коле з'яў, якія ў цэлым уключаны ў паняцце *мастацка-публіцыстычны дыскурс*, напрыклад, высвятляе гісторыю стварэння аўтарам канкрэтнага тэксту.

У такім разуменні рэцэпцыя мастацка-публіцыстычнага тэксту ўключае ў сябе не толькі тое, як тэксты ўспрымаюцца чытачамі і канкрэтна інтэрпрэтатарам, але і адначасова ўлічвае тое, як тэксты ствараюцца, каментуюцца, выдаюцца, дапаўняюцца ў перавыданнях, захоўваюцца.

Репозиторий БрГУ